№ 23 (520)
Чэрвень 2014 года

# Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года
bfk.by

## У нумары:

☞ Канферэнцыя: *навуковыя чытанні ў вёсцы Падбярэззе* – *стар. 2*

☞ Асоба: *настаўнік Яўген Петрашэвіч* – *стар. 3*

☞ Ваеннае маленства: *«Я знайшоў свайго Фёдаравіча»* – *стар. 5*

*Карціна Надзеі ЛІВЕНЦАВАЙ «Год 1941» (2009 г.)*

## На тым тыдні...

✓ **З 9 па 11 чэрвеня** ў філіяле Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа «Смольня» прайшоў **XVII Стаўбцоўскі рэгіянальны пленэр юных мастакоў «Дзе льецца Нёман срэбраводны...»**, прысвечаны 70-годдзю вызвалення Беларусі ад немецка-фашысцкіх захопнікаў і творчасці Якуба Коласа перыяду ваеннага ліхалецця.

Юныя мастакі Стаўбцоўскага, Барысаўскага, Нясвіжскага, Клецкага і Бабруйскага раёнаў атрымалі магчымасць увекавечыць у сваіх палотнах цудоўныя краявіды, не раз апетыя песняром. Пад час правядзення пленэра адбываліся сустрэчы з вядомымі пісьменнікамі і музейнымі работнікамі.

✓ **10 чэрвеня** ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы прайшла **літаратурная вечарына «З сусветам – па-беларуску»**, прымеркаваная да юбілею паэта, перакладчыка, лаўрэата прэміі імя Янкі Купалы і Нацыянальнай прэміі Італіі Уладзіміра Скарынкіна.

Асноўныя тэмы яго твораў – маленства, апаленае вайной, любоў да роднай зямлі, яе гісторыі, роздум над складанымі праблемамі сучаснасці, пытанні духоўнасці. Ён аўтар шэрагу зборнікаў вершаў, твораў для дзяцей, апошнім часам актыўна займаецца перакладчыцкай дзейнасцю. Аўтар перакладаў твораў Дантэ «Боская камедыя» і «Новае жыццё», паэмы «Дон Жуан» Джорджа Байрана.

✓ **10 чэрвеня** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылося **адкрыццё выстаўкі «Божы дар Івана Кандрацьева»**, прымеркаванай да 165-годдзя з дня нараджэння нашага выдатнага земляка Івана Кандрацьева, чыё імя да нядаўняга часу ў Беларусі было невядомым. Гэта выдатны паэт, празаік, перакладчык, аўтар шырокавядомых песень, драматург, чые творы неаднаразова выдаваліся вялікімі тыражамі. Але так здарылася, што мастацкая, навуковая і педагагічная спадчына слыннага беларуса выпала з поля зроку нашчадкаў. Выстаўка – яшчэ адна спроба пазнаёміць з асобаю і творчасцю выдатнага літаратара-самародка, пра якога ўпершыню ў нашай краіне загаварылі дзякуючы прафесару Аляксандру Смоліку (летась пабачыла свет яго манаграфія «Божы дар Івана Кандрацьева»). Арганізатары выстаўкі і прымеркаванага да яе мерапрыемства – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, НББ і Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры.

На выстаўцы можна пабачыць прыжыццёвыя выданні твораў пісьменніка, атрымаць асалоду ад вершаў, а таксама пачуць песні і рамансы на словы І. Кандрацьева.

✓ **12 чэрвеня** ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва прайшло **адкрыццё мастацка-адукацыйнага праекта «Штучны адбор»**. У экспазіцыі прадстаўлена больш за 200 твораў жывапісу і графікі выхаванцаў арт-студыі «Востраў», якія з'яўляюцца адлюстраваннем погляду некалькіх пакаленняў дзяцей на пераломе стагоддзяў. Студыя ажыццяўляе сваю дзейнасць з 1993 г. пры Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі.

Была таксама створаная ўнікальная інсталяцыя карты горада вачыма дзіцяці.

Выстаўка працуе па 21 чэрвеня.

✓ **12 чэрвеня** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылася **прэзентацыя кнігі** старшага навуковага супрацоўніка аддзела гісторыі Беларусі Сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі к.г.н., дацэнта **Анастасіі Скеп'ян «Князі Слуцкія»**, што выйшла летась у выдавецтве «Беларусь» у серыі «Беларуская гісторыя».

Манаграфія А. Скеп'ян «Князі Слуцкія» стала вынікам шматгадовай працы, пад час якой былі выяўленыя новыя архіўныя, малавядомыя звесткі. Яны дазволілі перагледзець традыцыйны погляд на ролю, якую адыгралі прадстаўнікі роду Алелькавічаў-Слуцкіх у грамадстве XV – XVI стст.

Да прэзентацыі прымеркаваная **выстаўка «Слуцк і яго ўладары»**, на якой экспануюцца выданні XVI – XXI стст. з фондаў аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў. Сярод іх – дакументы, якія сведчаць пра ўзнікненне і развіццё Слуцка, пра гісторыю яго ўладальнікаў – князёў Алелькавічаў, адлюстроўваюць розныя бакі грамадска-палітычнага жыцця тых часоў.

Наведнікі таксама могуць пазнаёміцца з навуковымі публікацыямі аўтара: аўтарэфератам дысертацыі, артыкуламі ў зборніках навуковых прац, матэрыялах канферэнцыяў і перыядычных выданнях.

Сябры! Падпісацца на газету на 2-е паўгоддзе 2014 года можна толькі да 25 чэрвеня

падпісныя індэксы:
індывідуальны - 63320
ведамасны - 633202

# Вайны вершаваны радок

Фота Зоі ГУКІНАЙ

***У рамках акцыі «Зноў памяці званяць званы: чытаем верш па-беларуску», аб'яўленай Брэсцкай абласной бібліятэкай імя Максіма Горкага, у Бярозаўскай ЦБС прайшоў раённы конкурс на лепшага чытальніка паэтычнага твора грамадзянска-патрыятычнага гучання.***

Сямнаццаць канкурсантаў рознага ўзросту прыехалі са сваімі бібліятэкарамі ў Бярозу, дзе ў чытальнай зале цэнтральнай раённай бібліятэкі іх чакалі святочная атмасфера, прыхільнае журы, мясцовае тэлебачанне, музычная праграма выхаванцаў дзіцячай школы мастацтваў.

Конкурс стаў сапраўды тэатрам аднаго акцёра, дзе кожны чытальнік прагнуў сілай сваёй творчай уявы, таленту дэкламатара спасцігнуць вобразнасць літаратурнага тэксту, ярка індывідуальна данесці яго да слухача. Плакалі шчырымі слязамі дарослыя, калі чытала верш Рыгора Барадуліна «Бацьку» чытачка Белаазёрскай дзіцячай бібліятэкі Анастасія Цэрковіч, вучаніца адзінаццатага класа. Скарылі сэрцы журы і аўдыторыі самыя маленькія канкурсанткі, чытачкі Сялецкай і Спораўскай сельскіх бібліятэк, чатырохкласніцы Таня Гусева і Алёнка Пашкевіч, якія таленавіта, па-акцёрску прачыталі вершы Петруся Броўкі «Мёртвая вёска» і Ірыны Касянковай «Сон». Прагучалі вершы Аркадзя Куляшова, Ніла Гілевіча, Рыгора Барадуліна, Алеся Бачылы, Аляксея Пысіна.

Юныя чытачы Белаазёрскай гарадской бібліятэкі імя Ніны Мацяш, Здзітаўскай і Міжлескай сельскіх бібліятэк Павел Казлоўскі, Яніна Бруйла, Дзіяна Пунько прапанавалі ўвазе слухачоў вершы аб вайне паэтаў-землякоў – Ніны Мацяш «Чэрвеньская балада 1941 года дня 25-га», Міколы Валошчыка «Здзітаўская абарона», Раісы Баравіковай «Маленькім партызанам Вялікай Айчыннай вайны прысвячаецца».

Эмацыйны ўплыў на аўдыторыю сілкаваўся музычнымі фанаграмамі, экранным відэашэрагам сюжэтаў ваеннага ліхалецця, рэтра-тэатралізацыяй. На вачах прысутных нараджалася арыгінальная кніжная выстаўка. Спачатку амаль што пустая, толькі ўпрыгожаная бярозавымі галінкамі, кумачовымі цюльпанамі, як сімваламі жыцця, адзінокім гадзіннікам-будзільнікам з замерлай стрэлкай на лічбе «чатыры раніцы» (калі пачалася Вялікая Айчынная вайна) і надпісам «Чытайце! Паэты пішуць пра вайну». А потым, пасля кожнага выступлення канкурсантаў, яна запаўнялася партрэтамі паэтаў, аўтараў вершаў.

Пераможцамі конкурсу журы назвала Анастасію Цэрковіч, Таню Гусеву, Алёну Пашкевіч. Уладальнікамі заахвочвальных прызоў сталі Павел Казлоўскі, Мікіта Карповіч, чытач Падкраіцкай сельскай бібліятэкі, і Дзіяна Пунько, чытачка Міжлескай сельскай бібліятэкі. Пераможцы і ўсе ўдзельнікі ўзнагароджаныя дыпломамі з лагатыпам конкурсу, каштоўнымі падарункамі і прызамі. Лепшыя чытальнікі выступяць на мясцовым радыё і ў тэлеэфіры.

Дзяцей-чытачоў і іх бібліятэкараў шчыра прывітаў пачэсны госць мерапрыемства, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны Фёдар Сцяпанавіч Труцько і параіў для чытання маладому пакаленню шэраг мастацкіх і дакументальных кніг аб мінулым ліхалецці.

Бібліятэчная акцыя «Зноў памяці званяць званы: чытаем верш па-беларуску» раскрыла не толькі мастацкую, эмацыйную сілу паэзіі, але і сілу думкі: што можа зрабіць кожны ў гэтым жыцці, каб спыніць на нашай «крывава-блакітнай планеце» (вобраз паэта-земляка Васіля Сахарчука ў вершы «Трывога») вар'яцтва, чалавечую агрэсію, праяўленне фашызму.

*Ала ДРАГАН, загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Бярозаўскай ЦРБ*

Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь

Ф.СП-1

АБАНЕМЕНТ *на газету* 63320 (індэкс выдання)

Краязнаўчая газета

Колькасць камплектаў

на 20__ год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету 63320 (індэкс выдання)

ПВ | месца | літар

Краязнаўчая газета

Кошт: падпіскі _____руб.; пераадрасоўкі _____руб.; Колькасць камплектаў

на 20__ год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

Індывідуальная падпіска – індэкс 63320

Ведамасная падпіска – індэкс 63202

*Не забудзьцеся, калі ласка, падпіска да 25 чэрвеня!*

# Чытанні ў Падбярэззі

***У невялікай вёсцы Падбярэззе, што каля Віцебска, у межах праекта «Жывая гісторыя майго краю» 30 і 31 мая прайшлі навуковыя чытанні.***

Вёска мае даўнюю гісторыю і ўпершыню сустракаецца на старонках пісьмовых крыніцаў з XVI ст. У 1612 г. тут нарадзіўся выдатны дыпламат, дзяржаўны дзеяч ВКЛ і Рэчы Паспалітай Ян Антоній Храпавіцкі, які вядомы сваім «Дыярыушам», што вёў на працягу ўсяго жыцця. Ягоны аб'ём складае 12 тамоў і з'яўляецца каштоўнай крыніцай па гісторыі краю і Усходняй Еўропы. У другой палове XX ст. Беларускім таварыствам сельскіх гаспадароў у вёсцы была створаная ўзорная ферма, у савецкія часы тут працягвала дзейнічаць навукова-даследчая ўстанова і вучэбная гаспадарка (вучгас) Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны. Тут працавалі над вывядзеннем новых якасцяў у буйной рагатай жывёлы і свіней. І цяпер тут стаяць старасвецкія гаспадарчыя будынкі з чырвонай цэглы былога маёнтка.

У памяшканні сельскага клуба 14 дакладчыкаў прачыталі паведамленні на разнастайныя тэмы, прысвечаныя гісторыі і сучаснасці вёскі. Сярод выступоўцаў, якія распавялі пра старажытную і сярэднявечную гісторыю вёскі, былі вучоны сакратар Інстытута гісторыі НАН Беларусі А. Салаўянаў (сам ураджэнец вёскі), выкладчыкі ВДУ імя П.М. Машэрава В. Таранеўскі, Д. Юрчак, намеснік дырэктара Віцебскага абласнога краязнаўчага музея В. Шышанаў, супрацоўнік гэтага ж музея У. Андрэйчанка. Пра таямніцы міжваеннага перыяду гісторыі вёскі (1917 – 1941) распавялі ў паведамленнях супрацоўнікі Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці С. Мясаедава, Г. Люсева, Т. Буевіч. Асабліва цікавым быў даклад былога дырэктара вучгаса С. Янчыка, які параўнаў, наколькі змянілася сітуацыя ў селекцыі з XIX ст. і за гады савецкай улады і незалежнай Беларусі. На жаль, не змог прыехаць (хаця і быў заяўлены сярод дакладчыкаў) славуты знаўца сядзібаў Беларусі, доктар біялагічных навук, прафесар А. Федарук.

Я. Храпавіцкі

Чытанні адбыліся ў межах ажыццяўлення міні-праекта, рэалізаванага Асацыяцыяй наймальнікаў і прадпрымальнікаў Віцебскай вобласці пры ўдзеле Інстытута міжнароднага супрацоўніцтва Нямецкай асацыяцыі народных універсітэтаў і Федэральнага міністэрства эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (ФРГ).

Па выніках канферэнцыі плануецца выдаць зборнік матэрыялаў. Але вельмі важна, што тая праца, распачатая дзякуючы прапанове кіраўніка праекта В. Кірылавай, будзе працягвацца. У кожнага даследчыка, які працаваў па тэме гісторыі Падбярэззя, засталіся пэўныя матэрыялы, што не ўвайшлі ў паведамленні на канферэнцыі. Яны ўбачаць свет на іншых навуковых канферэнцыях, а таксама ў выглядзе серыі артыкулаў у перыядычным друку пад агульнай назвай, напрыклад, «Падбярэзскія гісторыі». Напрыканцы канферэнцыі былі агучаныя прапановы: стварыць у бібліятэцы экспазіцыю, прысвечаную гісторыі і культуры вёскі, сярод дзяцей і дарослых правесці конкурс на распрацоўку герба вёскі, распрацаваць турыстычны маршрут, усталяваць помнік ці шыльду ў гонар Я. Храпавіцкага і іншыя.

***Галоўным вынікам чытанняў, думаю, можна лічыць тое, што нават самая маленькая вёсачка нашай краіны мае глыбокую гісторыю, якую трэба вывучаць і папулярызаваць, каб на яе аснове жыла і квітнела наша Беларусь!***

*Мікола ПІВАВАР*

# Пасашок у дарогу

## Слова пра настаўніка

***У мяне часта пытаюць, як я стаў кампазітарам. Пытанне складанае, але можна сказаць і коратка: я цалкам абавязаны свайму першаму музычнаму настаўніку Яўгену Петрашэвічу.***

У маленстве я вельмі любіў спяваць і з гатоўнасцю, ускараскаўшыся на табурэтку, даваў канцэрты для дарослых па ўсёй бліжэйшай акрузе. Тады я адчуў асалоду першага артыстычнага поспеху, але хутка зразумеў падвох – маіх слухачоў забаўляла, як я, малы, старанна капіяваў «дарослыя» пачуцці. У школе я ўжо стараўся не спяваць без патрэбы. І наогул, урокі спеваў мне вельмі не падабаліся. А на дзясятым годзе мой бацька (які сам у дзяцінстве хацеў іграць на скрыпцы) вырашыў заняць мяне карыснай справай. Толькі ж прыёмныя іспыты ў адзінай дзіцячай музычнай школе ўжо закончыліся. Але ў тым Гродне тутэйшыя людзі добра ведалі адно аднаго, і бацька дамовіўся аб прыватнай сустрэчы з вядомым скрыпачом і дырэктарам музычнай школы Мікалаем Гільдзюком. Я адважна праспяваў для яго «Ревела буря, гром гремел...». Пахваліўшы мяне, Мікалай Георгіевіч пацікавіўся ўзростам. Мне было 10. Прысуд быў катэгарычны – пачынаць кар'еру скрыпача позна. Але зазначыў, што з такімі здольнасцямі трэба заняцца музыкай.

Памятаю, як з бацькам першы раз пераступіў парог таямнічага будынка музычнай школы. У класе нас сустрэў высокі, хударлявы малады чалавек з вельмі выразнымі вачыма і з шавялюрай мастака ці дырыжора. Пазнаёміліся, і я пачуў, як бацька сказаў: «Аддаю табе сына. Навучы яго таму, што сам умееш». А настаўнік ужо ўмеў многае, яшчэ больш ведаў і хацеў зведаць! Засмучала толькі, што я, напэўна, «лішні» ў класе, бо мяне прынялі ў школу як бы дадаткова. Што ж, падумаў, я дакажу, што вы не памыліліся.

Навука пачыналася з самага малога: з выхавання ў агульным сэнсе гэтага слова. Гэта былі як бы ўводзіны ў храм мастацтва. Настаўнік строга сачыў за паводзінамі ў школе, патрабаваў, каб вопратка і абутак былі чыстымі, вучыў з павагай ставіцца да музычных інструментаў, прывучаў да акуратнасці ва ўсіх праявах.

Баян спачатку не хацеў не толькі іграць, але нават трымацца на каленях, пальцы не слухаліся. Але ўжо праз пару месяцаў настаўнік садзіўся за фартэпіяна, нешта дадаваў ад сябе, і нечакана атрымлівалася цудоўная музыка! Так я першы раз мімаволі далучыўся да таямнічага працэсу стварэння музыкі. Пазней даводзілася і спяваць, каб навучыцца правільнай музычнай фразіроўцы, і танчыць, каб адчуць асаблівасці рытму старадаўняга танца або характару персанажа. Так незаўважна і нязмушана мы ўцягваліся ў асаблівы свет артыстычнай гульні, вучыліся правілам сяброўскіх мастацкіх стасункаў. З вялікай радасцю я іграў на балалайцы-секундзе ў народным аркестры, якім кіраваў настаўнік. Бачыў, што партытуры ён піша сам. І гэта была яшчэ адна таямніца, якая прыцягвала і заваблівала мяне да музычных заняткаў. Але праз два гады Яўген Канстанцінавіч паехаў у Мінск. Усе ганарыліся, што ён будзе вучыцца на аддзяленні кампазіцыі.

Новы настаўнік быў інакшы. Ён шчыра выконваў свой абавязак – вучыў іграць на баяне, а мне зусім не хацелася іграць, як кажуць, «хутчэй і грамчэй». Аркестра не стала, у класе больш не імправізавалі. Заняткі музыкай страцілі для мяне прывабнасць. А самае галоўнае адрозненне было ў тым, што Яўген Канстанцінавіч, патрабуючы павагі да сябе, заўсёды паважліва ставіўся да вучняў. У той год я вырашыў, што з музыкай для мяне ўсё скончана. Але нечакана праз год Яўген Канстанцінавіч вярнуўся.

*Я. Петрашэвіч*

Узнавіліся заняткі *музыкай*. Яўген Канстанцінавіч паказваў нам свае новыя песні, якія цудоўна спявалі яго маці і сястра. Памятаю да гэтай пары ў іх выкананні «Нарачанскія сосны», «Калыханку». Па радыё часта гучала яго бадзёрае «Інтэрмецца» для кларнета і эстраднага аркестра. Я скончыў музычную школу і паступіў у Гродзенскае музычна-педагагічнае вучылішча. Але нашыя сустрэчы працягваліся. Я іграў у ягоным аркестры народнага ансамбля песні і танца. Там змог сачыць за ўсім творчым працэсам. Пры мне ставралася лепшая, як мне здаецца і сёння, вакальна-харэаграфічная кампазіцыя «Залатыя каласы» з цудоўнай харэаграфіяй Ларысы Ляшэнка. Потым пастаноўка была перанесеная ў Дзяржаўны народны хор.

Для Яўгена Канстанцінавіча быў зорны час. Гэта быў старанна прадуманы і падрыхтаваны адказ сапраўднага народнага таленту на ганенні, правакацыі, здзеклівыя ўхмылкі, сатысфакцыя за крыўду і несправядлівасць.

У музычнай школе я быў яшчэ занадта малы, каб адчуць, якія псіхалагічныя перамены адбыліся ў любімым настаўніку за год яго адсутнасці... Паляцеўшы з правінцыйнага Гродна ў вольны, як яму здавалася, свет, ён апынуўся ў цеснай клетцы савецкай навучальнай установы. Татальны ідэалагічны кантроль адчувалі на сабе і педагогі, і студэнты. Расчараваны ў сваіх надзеях здабыць вольны абшар для музычнай творчасці, Яўген Канстанцінавіч рашуча парваў стасункі з сістэмай. Цяпер ён з юнацкім максімалізмам пачаў пазбягаць у мастацтве і жыцці ўсяго, што навязвалася яму і ўсяму грамадству звонку, адкуль бы тое ні зыходзіла. Ён цураецца і афіцыйнага мастацтва, і эксперыментаў як савецкіх кампазітараў, так і заходніх авангардыстаў. Трэба шукаць сваё, адметнае.

Вяртанне на радзіму стала для яго пачаткам вяртання да сваіх каранёў, да сваёй сапраўднай існасці. Свой духоўны паратунак і паратунак моладзі бачыць толькі ў вяртанні да мудрасці продкаў, да традыцыйных каштоўнасцяў. Не маючы падтрымкі і аднадумцаў, распачынае асабістую вайну з абыякавасцю, шэрасцю, пошласцю, нацыянальным нігілізмам. Ён неабачліва не хаваў сваіх поглядаў... Вольнымі паводзінамі нажываў сабе нядобразычліўцаў сярод зайздросных калегаў і чынавенства. На ўсялякі выпадак адлучылі яго ад выхавання «новага пакалення будаўнікоў камунізму». Я. Петрашэвіч пайшоў да аматарскіх мастацкіх калектываў Гродзеншчыны.

У музычным вучылішчы я не вызначыўся з будучай прафесіяй. Камусці прыйшла думка, што я ўпотай пішу музыку, і сказаў аб гэтым старшыні Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі кампазітару Эдзі Тырманд. За тры дні, пакуль ішлі дзяржаўныя іспыты, я напісаў дзве інструментальныя п'есы, якія ёй паказаў. Нечакана для сябе атрымаў рэкамендацыю павучыцца на кампазітарскім аддзяленні. З гэтай навіною прыйшоў да Яўгена Канстанцінавіча. Ён паставіўся да прапановы вельмі стрымана, з недаверам. А з іншага боку, – чаму б вучню не ўзяць рэванш за крыўду настаўніка?

На падрыхтоўчым аддзяленні я пачынаў з нуля. Яўген Канстанцінавіч мяне падбадзёрваў і падтрымліваў. Я са здзіўленнем пачаў усведамляць, што ***кампазітарам я стаў раней, чым пачаў пісаць музыку***. Увесь час, пакуль слухаў, назіраў за працай, мімаволі сачыў за жыццём свайго настаўніка, у ва мне ішло фармаванне адмысловага тыпу творчай натуры. Гэтае маё другое «я» пастаянна штурхала мяне на свавольныя ўчынкі. Цяпер і Яўген Канстанцінавіч заўважыў хібы майго стыхійнага кампазітарскага выхавання і, з улікам свайго жыццёвага досведу, перасцерагаў мяне ад памылак.

Хоць жылі мы ўжо далёка адзін ад аднаго, сувязі нашыя былі вельмі моцныя. Яўген Канстанцінавіч даўно стаў сваім чалавекам для ўсёй маёй радні. Без яго не абыходзілася ні адно сямейнае свята. Па-ранейшаму ён быў для мяне самым галоўным аўтарытэтам. Яго трапныя заўвагі заўсёды здзіўлялі мяне нечаканасцю і парадаксальнасцю.

Гутарка з Яўгенам Канстанцінавічам увесь час патрабавала напружанай працы розуму. Яго мова была насычанай паэтычнымі параўнаннямі, метафарамі, часта аздаблялася народнымі прымаўкамі, прыказкамі, жартамі. Часам з ім можна было паспрачацца, але безвынікова. Напрыканцы ён як быццам і пагодзіцца з табою, але кропку паставіць яго сакраментальнае: «Так то яно так. Але, як *той* казаў...».

Як бы то ні было, а кампазітарам я стаў дзякуючы незвычайнаму педагагічнаму таленту і чалавечай тактоўнасці Яўгена Канстанцінавіча. Ён не вучыў мяне рамяству кампазітара – гэта рабілі Анатоль Багатыроў, Уладзімір Алоўнікаў, Альберт Леман і іншыя педагогі ў беларускай і маскоўскай кансерваторыях. Майстэрства я ўдасканальваў ужо самастойна, калі вывучаў творы класікаў. Я ўдзячны першаму настаўніку за тое, што ўвёў мяне ў дзіўны, таямнічы, схаваны ад старонняга вока свет мастацтва, і даў мне ў рукі пасашок на дальнюю дарогу. Той нябачны пасашок, відаць, і стаў пропускам у прафесію кампазітара.

*Віктар ВОЙЦІК,*
*кампазітар*

### Даведка

**Яўген Канстанцінавіч ПЕТРАШЭВІЧ** нарадзіўся 18 чэрвеня 1930 г. у вёсцы Падбараны Мастоўскага раёна.

Настаўнік музыкі, закончыў Мінскую музычную вучэльню (1955). Акампаніятар Беларускай дзяржаўнай эстрады (1955 – 1956); выкладчык Гродзенскай музычнай школы па класе баяна, цымбалаў, народных інструментаў, кампазіцыі (1956 – 1970); кіраўнік аркестравай групы народнага ансамбля песні і танца «Нёман» г. Гродна (1976 – 1981); кіраўнік аркестра народных інструментаў Гродзенскага абласнога палаца піянераў і школьнікаў (1981 – 1990); кіраўнік фальклорнага ўзорнага ансамбля «Гарадзенскія дударыкі» (1990 – 2002).

Я. Петрашэвіч з'яўляецца сябрам Гродзенскага клуба кампазітараў-аматараў. Аўтар вакальна-харэаграфічных кампазіцыяў і песень.

Узнагароджаны знакам «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» (1995), Ганаровымі граматамі Міністэрства культуры СССР і БССР (1964), Вярхоўнага Савета БССР (1965) і іншымі ўзнагародамі. Дыпламант 6-га Міжнароднага фестывалю народнай музыкі. Узнагароджаны Дыпломам абласнога конкурсу кампазітараў-аматараў Гродзеншчыны за цыкл песень-баладаў гістарычнай тэматыкі на вершы Яна Чачота.

# Памяткі даўняй вайны ў Нясвіжскім раёне

*(Працяг. Пачатак у № 22)*

Германская авіяцыя рабіла налёты на чыгуначныя станцыі. Газета «Минский голос» неаднойчы паведамляла пра бамбардаванне Замір'я (Гарадзеі). Так, у маі 1916 года здарыўся вялікі пажар ад таго, што нямецкі самалёт скінуў бомбы, згарэла больш за сто дамоў і крамаў.

У пачатку 1916 года на ўчастак фронту, што прымыкаў да Баранавічаў, быў накіраваны Грэнадзёрскі корпус. У яго складзе дзейнічаў Нясвіжскі 4-ы грэнадзёрскі генерал-фельдмаршала князя Барклая дэ Толі полк. Да гэтага часу ён знаходзіўся на Заходнім фронце ў складзе 3-й арміі на Палессі, у кастрычніку 1914 года адбіваў наступленне 11-й аўстра-венгерскай арміі. У час Баранавіцкай аперацыі ваяваў супраць 51-га ландвернага палка германцаў.

У час наступлення рускай арміі ў 1916 годзе павялічылася колькасць параненых, якіх размясцілі ў лазарэтах Снова, Замір'я, у шпіталі, што дзейнічаў у замку Радзівілаў. Санітарамі працавалі мясцовыя жыхары. Сярод іх было шмат навучэнцаў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі. Педагагічная рада гэтай установы штомесяц ахвяроўвала сродкі Расійскаму Чырвонаму крыжу. Уладальнікі замка таксама не засталіся ўбаку. Княгіня Радзівіл працавала сястрой міласэрнасці ў шпіталі. Князь Мікалай Радзівіл з першых дзён вайны ўступіў у армію Расіі. 30 лістапада 1914 года ён загінуў ва Усходняй Прусіі.

У Нясвіжы пад час Першай сусветнай вайны бываў вядомы рускі празаік Канстанцін Паўстоўскі. Тут ён ляжаў у шпіталі пасля ранення. Некаторы час кватараваўся з атрадам у Замір'і. Пра гэта пісьменнік згадваў у аўтабіяграфічнай аповесці «Гнилая зима»: *«В октябре на фронте наступило затишье. Наш отряд оставался в Замирье, вблизи железной дороги из Баранович в Минск. В Замирье отряд простоял всю зиму. Ничего более унылого, чем это село, я не видел в жизни. Низкие обшарпанные хаты, плоские, голые поля, и ни одного дерева вокруг. Этот угрюмый пейзаж дополняли грязные обозные фуры, косматые худые лошади и обозные солдаты, совершенно потерявшие к тому времени "бравый воинский вид". Их облезлые папахи были драные, наушники на них торчали в стороны, ватники блестели от сала. Шинели были подпоясаны вервием»*.

Позняй восенню 1916 года на Заходні фронт прыязджаў Мікалай II. Ён наведаў і Замір'е. *«Ко времени его приезда было приказано привести село в порядок. Это выразилось в том, что из лесу привезли много ёлок и замаскировали самые дрянные халупы»*, – піша Паўстоўскі.

Такім чынам, Першая сусветная вайна глыбока закранула Нясвіжчыну. Жыхары адчулі на сабе цяжар надзвычайнага становішча. На тэрыторыі раёна былі сканцэнтраваныя вялікія групы бежанцаў. Праводзілася эвакуацыя дзяржаўных установаў. З 1915 да 1918 года Нясвіжчына была прыфрантавой зонай, дзе размяшчаліся рэзервовыя часці рускай арміі.

*«Можна смела сцвярджаць: ні адна вайна не пакінула на тэрыторыі Беларусі столькі матэрыяльных сведкаў, як Першая сусветная. Большасць такіх аб'ектаў пакуль не ўваходзіць ні ў якія спісы гістарычных каштоўнасцяў. Аднак, на мой погляд, у сваім комплексе ўсе гэтыя незлічоныя бетонныя доты, кіламетры аплыўшых ад часу акопаў, дзясяткі салдацкіх могілкаў, а таксама іншыя сведкі той, першай глабальнай катастрофы XX стагоддзя – з'яўляюцца ўнікальным гістарычным помнікам на тэрыторыі Беларусі»*, – піша даследчык ваенных пахаванняў Уладзімір Багданаў у артыкуле «Беларусь у гады Першай сусветнай вайны».

Ведаючы, што тэрыторыя раёна цягам некалькіх гадоў была прыфрантавой зонай, мы вырашылі знайсці абарончыя збудаванні, якія маглі быць тут узведзеныя. Вялікую дапамогу ў гэтым аказала жыхарка вёскі Вайнілавічы Марыя Сцяпанаўна Шуста. *«Калі я хадзіла ў лес, што знаходзіцца за сялом*, – узгадвае яна, – *то бачыла там вялікія равы. Старыя людзі казалі, што гэта акопы, якія выкапалі ў тую царскую вайну»*. Удалося адшукаць іх. Праз увесь лес каля Вайнілавічаў працягнулася лінія акопаў. Дабрацца да іх сёння вельмі складана, практычна ўсе зараслі хмызняком. Лес на гэтым месцы быў пасаджаны прыкладна пяцьдзесят гадоў таму. А ў час Першай сусветнай там была адкрытая мясцовасць на высокім узгорку. У нашыя дні можна заўважыць вырытыя салдатамі бліндажы. Акопы захаваліся толькі ў лесе. Астатняя частка была знішчаная пад час правядзення сельскагаспадарчых работ.

М. Шуста, у яе сям'і захоўваецца салдацкая прасціна, в. Вайнілавічы

Жыхар Мінска Ю. Верамейчык, ураджэнец вёскі Вайнілавічы, у мінулым выкладчык матэматыкі ў адной з мінскіх ВНУ, расказваў: *«Мой бацька ўспамінаў, што гэтыя акопы былі другой лініяй абароны рускай арміі. Першая была каля Баранавічаў. Умацаванні каля Вайнілавічаў былі зробленыя на той выпадак, калі немцы прарвуць першую абарону. Баёў з 1915 па 1917 год тут не было. Гэтыя акопы цягнуліся на далёкую адлегласць, аж да вёскі Надзея»*. Вёска Надзея размяшчалася прыкладна за сем кіламетраў ад Вайнілавічаў. Сёння там ніхто не жыве. Рэшткі акопаў, што знаходзяцца ў невялічкім ляску, захаваліся да нашых дзён. Яны знаходзяцца ў такім жа запушчаным стане, як і акопы непадалёк Вайнілавічаў. Большая частка зраўнялася з зямлёй пры разворванні палёў. На жаль, нават не ўсе мясцовыя жыхары ведаюць, што побач знаходзіцца ўнікальны гістарычны помнік часоў Першай сусветнай.

Яшчэ адно збудаванне часоў вайны размешчанае паміж вёскамі Сноў і Клепачы. Гэта насып, па якім у гады Першай сусветнай рускімі салдатамі была пракладзеная вузкакалейка. Чыгунка мела працягласць каля двух кіламетраў і злучала Сноў і станцыю Хвоева, праз якую праходзіць Брэст-Маскоўская чыгунка. У сноўскім палацы Рдултоўскіх знаходзіўся лазарэт.

Па вузкакалейцы дастаўлялі параненых рускіх салдатаў і афіцэраў з фронту. Рэйкі былі разабраныя яшчэ да Вялікай Айчыннай вайны. Значная частка насыпу зраўнялася. У наш час яго засталося прыкладна трыста метраў. Рэшткі былой чыгункі добра бачныя нават з далёкай адлегласці. Аднак пра існаванне і гэтага помніка ведаюць толькі мясцовыя жыхары.

Наступнае месца, што нас зацікавіла, знаходзіцца на ўскрайку Нясвіжа. Гэта так званая Войтаўшчына. У гады Вялікай Айчыннай вайны фашысты тут расстралялі мірных жыхароў горада. А ў часы Першай сусветнай на гэтым месцы знаходзіўся аэрадром. У горадзе базаваўся авіяполк. Паводле некаторых звестак камандзірам авіяпалка быў жыхар Нясвіжа. На жаль, высветліць яго імя не ўдалося. Сёння на месцы былога аэрадрома знаходзіцца аўтадром. І калі ў памяць аб ахвярах фашызму ўстаноўлены помнік, то аб існаванні тут у гады Першай сусветнай вайны аэрадрома і размяшчэнні ў горадзе авіяпалка цяперашнім жыхарам невядома.

Ручнік, які прынёс з фронту як падарунак салдат Сцяпан Шуста, в. Вайнілавічы

Брацкія магілы ў в. Вайнілавічы

Месца, дзе знаходзіўся аэрадром

*Наталля ЧАДОВІЧ,*
*настаўніца гісторыі СШ № 4,*
*г. Нясвіж*

*(Заканчэнне будзе)*

# Я ніколі не казаў яму «тата»

***Раней я распавядаў чытачам «Краязнаўчай газеты» пра свайго бацьку – Конана Котава. Нагадаю: так здарылася, што ён у чэрвені 1941-га з Рэчыцы пайшоў абараняць Радзіму ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, а праз чатыры месяцы нарадзіўся я. Я быў другім дзіцем у маёй дарагой матулі, цёткі Параскі, як называлі яе суседзі.***

Цяпер часта думаю, як было ёй цяжка гадаваць нас, апранаць, выхоўваць годнымі людзьмі. Працавала маці на рэчыцкім фанерна-мэблевым камбінаце. Памятаю яе жылістыя рукі, парэпаныя пяткі (тады ўсе балячкі людзі мазалі салідолам для машынаў). Вельмі цяжка яна працавала, а тут яшчэ і мы – неслухмяныя, галодныя.

Пра бацьку атрымалі паперку, што прапаў без вестак. Але і мама, і мы, сыны, чакалі, не верылі, што Конан наш не вернецца... Так мама засталася адна, бо вельмі кахала майго бацьку, які не пабачыў мяне, а я – яго. Ды і здымка не засталося. Калісьці быў адзін, жоўты і заламаны, ды й той знік.

Калі я трохі падрос, мяне брала зайздрасць, калі глядзеў на дзетак, якія трымалі тату за руку ды падскоквалі, звярталіся да яго «мой татачка». Тады вырашыў: буду абавязкова шукаць звесткі, хай на гэта пойдзе ўсё жыццё. Яшчэ малы хадзіў у міліцыю, там пасылалі ў ваенкамат, гарвыканкам... Але аднаго разу пашанцавала. Я быў пяцікласнікам, патрапіў у бальніцу ў Гомелі. У палаце было чалавек восем дарослых. Мяне выклікалі да лекара, а калі вярнуўся, адзін пажылы чалавек запытаўся: «А твой бацька не Котаў Конан?». Адказаў, што я Конанавіч. Калі прыехала да мяне маці, ён і распавёў, як загінуў мой бацька, а сам цудам выжыў.

Вось расповед суседа па палаце (на жаль, не назаву ўжо, як звалі яго самога):

– Мы ехалі ў таварным вагоне. Немцы захапілі нас у палон і везлі ў Баранавічы, дзе была зона для палонных. Там адбіралі здаровых, каб везці далей на працы ў Германію. З'явілася ў лагеры цяжкая хвароба – халера. Слабыя, нямоглыя палонныя падалі, бы мухі. Іх ніхто не хаваў, проста складвалі ў кучы, а затым бульдозеры зграбалі ў глыбокую яму. Гэта непадалёк чыгуначнага вакзала.

Расповед запаў мне ў сэрца. І вось праз дваццаць гадоў я прыехаў у Баранавічы, там ужо стаяў абеліск загінулым палонным, але ніводнага прозвішча не было. Доўга я праседзеў побач. Думкі былі розныя... Падышоў нейкі чалавек і расказаў аб трагедыі салдатаў.

Жыццё працягваецца; а мяне не пакідала жаданне хоць нешта яшчэ даведацца пра тату.

Ужо нядаўна я браў удзел у свяце гарадскога пасёлка Уваравічы, што ў Буда-Кашалёўскім раёне. Там і пазнаёміўся з Любоўю Мацвееўнай Родавай, якая ўзначальвае ветэранскую арганізацыю пасёлка. Ладзяць канцэрты для хворых, дапамагаюць нямоглым, даглядаюць помнікі. А яшчэ яна займаецца пошукам землякоў. Яна і дапамагла знайсці, адкуль прызываўся на фронт Конан Котаў, што ягонае імя па бацьку Фёдаравіч... Пачуўшы новыя звесткі, ад радасці хацеў скакаць і спяваць, хаця ўжо было мне 72 гады. А я шчаслівы – мой тата са мной, ён знайшоўся. Хачу нізка пакланіцца Любові Мацвееўне, дзякуючы якой даведаўся новыя факты.

Я пайшоў у царкву, паставіў свечку і прашаптаў: «Ты са мною, мой бацька, мой Фёдаравіч». Шкада толькі, мама не дажыла да гэтых дзён. Цяпер думаю: можа, і здымак дзесь знойдзецца?

Шмат каму дапамагла Л. Родава, многім прынесла радасць атрымаць новыя звесткі пра родных і блізкіх. Дзякую ёй і яе сябрам. Таму і пішу гэтыя нататкі для «Краязнаўчай газеты», каб словы радасці і падзякі дайшлі да гэтай цудоўнай жанчыны.

*На фота 1941 г.: нямецкі афіцэр і палонныя на фоне ўваходных варотаў лагера ў Баранавічах (на месцы сённяшняй гарадской турмы)*

*Мікола КОТАЎ, пазаштатны карэспандэнт «Краязнаўчай газеты», фалькларыст*

*Рэгіён*

# Анопаль – былы маёнтак Радзівілаў

*(Заканчэнне. Пачатак у № 22)*

Ёсць у архіве дакумент, што расказвае, які прыбытак давала тая ці іншая галіна: земляробства – 5 870 руб.; жывёлагадоўля і агародніцтва – 1 500 руб.; гарачае віно – 210 руб.; млын – 475 руб. і г.д.

Але ў той жа час знайшлося шмат дакументаў, судовых іскаў, па якіх Аляксандр Дамінікавіч Радзівіл вінен усім і ўся. Крэдыторы нават патрабавалі адсоткі на кожны рубель срэбра доўгу.

З апавяданняў мясцовых жыхароў вядома, што батракам у фальварку Анопаль жылося нядрэнна. Для іх былі пабудаваныя 3 баракі, якія захаваліся да нашых дзён. Ім дазвалялася мець сваю скаціну і нават трымаць яе ў панскіх хлявах. Калі карова парабка была ў запуску, пан даваў кварту малака для сям'і батрака. Калі не хапала сена або саломы, можна было карыстацца з панскіх запасаў. Здольных дзяцей парабкаў вучылі грамаце. У іншых вёсках маёнтка такога не было. Аднак большасці сялянскіх гаспадарак не хапала хлеба ад ўраджаю да ўраджаю, многія сем'і галадалі, жылі ў напаўцёмных хатах без падлогі. Вымушаныя былі хадзіць у Мінск, каб прадаць што-небудзь і мець наяўнае срэбра.

З архіўных дакументаў таксама вядома, што сяляне з навакольных вёсак пачалі патроху выкупляць землі ў пана. Ёсць дакументы, якія пацвярджаюць гэта. У кожнай вёсцы маёнтка Анопаль цана на зямлю была розная: ад 80 капеек срэбра да 1 рубля 60 капеек. Тым сялянам, якія выкуплялі зямлю, Аляксандр Дамінікавіч даваў пасведчанне на права карыстання. Кожны селянін мусіў плаціць за гэтую зямлю падатак. Разам з тым, князь Радзівіл павінен быў даць яшчэ сваім пакупнікам на зямлю купчыя, але не зрабіў гэтага. Таму пасля яго смерці сяляне судзіліся з нашчадкамі – Іаанай Якаўлеўнай Радзівіл і яе пасынкам Вільгельмам. Але з архіўных дакументаў зразумела, што Вільгельм за ўдзел у палітычных мецяжах быў пазбаўлены спадчыны і высланы ў Сібір. Маёнтак Анопаль быў перададзены ў захоўную казну дзяржавы. Іаана Якаўлеўна пражыла ў Анопалі да самай смерці.

*Чан – усё, что засталося ад крухмальнага завода*

Крыху пра Вільгельма, сына Аляксандра Дамінікавіча. Паводле архіўных дакументаў ён быў высланы ў Сібір. А вось што распавядалі старажылы і яшчэ калісьці пісаў Іван Грамовіч, продкі якога жылі ў гэтым маёнтку ў вёсцы Закружка. Вільгельм быў вельмі распешчаны, жыў за мяжой у Францыі, атрымаў адукацыю і ажаніўся з французжанкай-акцёркай. Вярнуўшыся дадому, ён паставіў у вядомасць бацьку і мачаху. Яны былі абураныя, што нявестка бязродная, і не дазволілі яму ехаць за ёй, не далі свайго дабраславення. Вільгельм страціў розум, хадзіў па ўсіх вёсках, як бадзяжка, мог улегчыся на мосце, які злучаў Анопаль з Крупіцай, і ляжаць, пакуль не надакучыць. У гэты час сяляне ехалі хто на млын, хто з млына. Усе стаялі і чакалі, калі ён сыйдзе. Вільгельма вазілі на лячэнне ў Германію, у Польшчу, але нічога не дапамагло. Памёр ён у Галіцыі ў 1883 годзе. Пасля яго смерці нашчадкам павінна была стаць яго жонка-французжанка. Каб гэтага не дапусціць, Іаана Радзівіл прадала маёнтак Анопаль Адаму Уладзіслававічу Красінскаму. Атрыманыя грошы аддала непрызнанай нявестцы. Памерла Іаана ў 1904 годзе. Рухомая маёмасць, напэўна, не была ўключаная ў завяшчанне, якое прадугледжвала пераход маёнтка Красінскім, паколькі шмат рэчаў перайшло нашчадкам сястры княгіні Іааны Радзівіл – Янушу Уняхоўскаму ў Русінавічы і яго сястры Яне Зджэхоўскай, народжанай Уняхоўскай. У асноўным гэта была мэбля XVIII стагоддзя: люстэрка, фарфор еўрапейскай вытворчасці, а таксама калекцыя карцінаў, пераважна сямейныя партрэты XVIII і першай паловы XIX стагоддзяў. Частка калекцыі з Анопаля, якая знаходзілася ў Русінавічах, загінула або была згубленая ў 1917 годзе. Некаторыя прадметы атрымалася выратаваць. Пазней яны папоўнілі польскія дзяржаўныя музеі: 2 мініяцюры на слановай косці, выкананыя невядомым аўтарам, якія прадстаўляюць князя Аляксандра Радзівіла ў дзіцячым узросце (5,8 х 4,7 ) і ўжо дарослым мужчынам (5,5 х 4,5), партрэты бацькоў Іааны (Малгажаты Шафнагель, самога барона Яўхіма Шафнагеля і сястры Іааны Радзівіл – баранэсы Урангель, народжанай Шафнагель).

*Вадзяны млын (фота 1953 г.)*

Калі ў маёнтку правіў Адам Красінскі, зямлі было менш, бо яе прадалі сялянам. У архіве знойдзены план зямель, якія дасталіся яму. Але сам фальварак быў, як і раней, дагледжаны. Працавалі і крухмальны завод, і млын, і сыробойня, і бровар, і г.д. Пасля смерці Красінскага ў 1909 годзе маёнтак перайшоў да яго пляменнікаў Тышкевічаў. Паколькі яны былі яшчэ непаўнагадовымі, то кіраваў усімі справамі прыватны паверaны Стэфан Юльянавіч Паўловіч. Часта прыязджаў у маёнтак граф Няжынскі, сваяк малалетніх Тышкевічаў. Калі ён ад'язджаў, заставаўся кіраваць справамі ўпаўнаважаны Ільніцкі і касір Труноўскі. Пазней, успамінаюць старажылы, Ганна Марыя Тышкевіч пражыла ў Анопалі да 1926 года. Ставілася яна да жыхароў маёнтка вельмі добра. Калі хварэў хто-небудзь з парабкаў, яна тут жа несла адвары, лекі ім дадому. У 1926 годзе яе сваяк Чарвякоў дапамог ёй і яе сям'і з'ехаць у Варшаву. Жыхар Анопаля цяпер узгадвае, што сказалі паны, калі з'язджалі да сябе ў Польшчу: «Будзе дрэнна – толькі не нам, будзе добра – толькі не вам».

**P.S.** Напрыканцы хочацца падзякаваць нашай чытачцы Ірыне Капельян за дапамогу, якую яна аказвае ў напісанні летапісу.

*Людміла ЛЮТАРОВІЧ, бібліятэкар I катэгорыі Анопальскай сельскай бібліятэкі*

# «Там кожны быў героем»

***Да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Міханавіцкай цэнтральнай бібліятэцы прайшоў вечар памяці «Там кожны быў героем».***

Міханавіцкая зямля страціла шмат сваіх сыноў, многія з якіх загінулі на чужыне. Пра многіх з іх няма звестак у афіцыйных выданнях, аднак памяць пра іх захоўваецца ў сем'ях, у сэрцах родных і блізкіх. І вельмі важна, што ў наш час ёсць людзі, неабыякавыя да лёсу невядомых герояў-землякоў, якія прыкладаюць шмат намаганняў, каб памяць пра іх перадавалася наступным пакаленням.

На мерапрыемства былі запрошаныя сваякі загінулых суайчыннікаў: Марыя Каленік – сястра братоў Каленікаў і стрыечная сястра Бельскіх; Эліна Кісялёва з дачкой – унучка Ахрамовічаў; Рэгіна Ліштван – дачка М. Ліштвана. У знак падзякі і глыбокай павагі, у знак смутку аб загінулых у Вялікай Айчыннай вайне прысутныя ўшанавалі іх памяць хвілінай маўчання.

Ярка і вобразна прадставіць падзеі ваеннага часу дапамаглі вершы пра вайну, з вялікім пачуццём прачытаныя вучнямі Міханавіцкай школы. Класны кіраўнік Валянціна Скрыпка выканала песню «Было ў салдата два полі».

Вялікую працу з моладдзю па патрыятычным выхаванні праводзіць кіраўнік школьнага гісторыка-краязнаўчага музея Марыя Леўкавец. На сустрэчы яна выказала словы падзякі Святлане Бачыла за неацэнны ўнёсак па папаўненні краязнаўчымі матэрыяламі фондаў музея. С. Бачыла доўга збірала звесткі пра загінулых і зніклых у гады Вялікай Айчыннай вайны. На аснове гэтых матэрыялаў былі падрыхтаваны зборнік і прэзентацыя «Ці не таму мы жывем, што памерлі яны?».

Хочацца асабліва падзякаваць людзям, што займаюцца пошукам родных і блізкіх, нашчадкаў тых герояў, якія загінулі пад час вайны. Пакуль ёсць такія людзі, можна быць упэўненым – памяць будзе жыць! Нізкі паклон вам і шчырыя словы падзякі за вашу неацэнную працу!

*Святлана КОЎЗЕЛЕВА,*
*Мінская РЦБ*

# 70 патрыятычных справаў

Сучаснае прагматычнае і імклівае жыццё стымулюе да актыўнасці. У рамках праграмы **«Бібліятэка, патрэбнае грамадству»** Бярэзінская ЦБС штогод рэалізуе інавацыйна-творчыя праекты, акцыі. Шырокі рэзананс у вобласці і краіне ў мінулыя гады атрымалі нашыя праекты «Свята кнігі пад адкрытым небам», «Аграгарадок – зона цвярозасці і некурэння».

У 2014 годзе стартаваў бібліятэчны **праект «70-годдзю вызвалення – 70 патрыятычных справаў»**. Пра маштабнасць яго гаворыць сама назва. Літаральна штомесяц цягам года ладзяцца мерапрыемствы ваенна-патрыятычнага накірунку. *У студзені* праведзены цыкл мерапрыемстваў «Імёны ў летапісе вайны». 95-гадоваму юбіляру, ганаровану грамадзяніну г. Беразіно, легендарнаму партызану Міхаілу Чорнаму, пісьменніку-перакладчыку Міхаілу Ханінаву былі прысвечаныя экспазіцыя «Кніжны чамадан знакамітасці» і вечар-партрэт «Гераічны партрэт вызваліцеля». Да 50-годдзя выбрання прэзідэнтам АН Беларусі ўраджэнца Бярэзіншчыны Мікалая Барысевіча была прымеркаваная вечарына мужнасці і гонару «Партызанскія дні прэзідэнта». Акцыя «Памяць бярэзінскіх вуліц» уключала цыкл трыбунаў гонару «Іх імёнамі названы вуліцы г. Беразіно». *У лютым* прайшла **акцыя памяці ахвяраў Ленінградскай блакады «Горкай памяці свечка»**, заключным мерапрыемствам якой стаў вечар смутку «Дзяўчынка ў блакадным Ленінградзе» з удзелам былой блакадніцы, жыхаркі Беразіно Клаўдзіі Жэшка. Без жанчынаў у 1945-м, магчыма, не было б пераможнай вясны, таму *ў сакавіку* прайшоў **тыдзень ушанавання жанчынаў-франтавічак «У Перамогі жаночы твар»** з правядзеннем візіт-акцыяў да зямлячак ваеннай біяграфіі «Хата з чырвонай зорачкай» і гадзінаў далучэння да подзвігу бярэзінскіх старшакласнікаў «Ішлі дзяўчаты па вайне» з выкарыстаннем прыёма мона-тэатралізацыі ўспамінаў зямлячак, гераіняў легендарнай кнігі аб вайне, перакладзенай на 20 моваў, – «У вайны не жаночы твар» Святланы Алексіевіч.

**Акцыя ўшанавання салдацкіх удоваў «Вечны агонь – у сэрцы жаночым»** уключала вечар-рэквіем па забітым вайной каханні «Іх разлучыла вайна» з удзелам афіцэрскай удавы Ганны Выгоўскай. *У красавіку* да Міжнароднага дня вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў прайшоў **тыдзень памяці «Пакуль жывем – памятаем»**. У Бярэзінскім раёне жывуць 55 ахвяраў карнай нямецкай аперацыі па гвалтоўным вывазе ў Германію на прымусовыя катаржныя работы: 16 у Беразіно, 39 – у 29-і вёсках. Супрацоўнікі Бярэзінскай ЦБ і 10 сельскіх бібліятэк раёна з далучэннем бібліятэчных актывістаў-школьнікаў ладзілі надомныя візіт-акцыі да землякоў трагічнага лёсу. У школах прайшлі прэзентацыі бібліятэчных кніг успамінаў землякоў «Вайна маю памяць дагэтуль катуе».

Заключнае мерапрыемства тыдня памяці – вечар-рэквіем «Мы рабамі не сталі, хоць насілі метку раба» на базе раённай бібліятэкі прадставіў слайд-прэзентацыю «І памятаць страшна, і забыцца нельга» паводле архіўных матэрыялаў жыхароў Беразіно, тэатр-маналог «У кандалах і цела, і душа», успаміны запрошаных на мерапрыемства былых выгнанніцаў на прымусовыя работы Ліліі Бурымскай, Соф'і Барысевіч, Ганны Булындзенкавай. У гонар *майскіх святаў* прайшла **акцыя «Дзякуй, ветэраны, за свет уратаваны»** з арганізацыяй персанальных надомных візітаў удзячнасці да кожнага з 20-і жыхароў Беразіно – удзельнікаў вайны з уручэннем вершаваных «Знакаў падзякі, знакаў пашаны», памятных падарункаў, запісам успамінаў, зборам звестак аб узнагародах. У рамках **акцыі да Сусветнага дня медыцынскіх сясцёр** старшакласнікам быў прапанаваны **вечар-партрэт «Белыя анёлы ў пекле вайны»** франтавой медсястры Антаніны Трубскай.

Вайна стала агульнай біяграфіяй цэлага пакалення «дзяцей вайны», з парога дзяцінства яны ступілі ў самае пекла. Да Дня абароны дзяцей прайшла **акцыя-абвінавачванне «Вайна – злачынства перад дзяцінствам»**. Бібліятэкары наведваюць летнія пляцоўкі раённага дзіцячага аздараўленчага лагера «Папараць-кветка» і прышкольных лагераў дзённага знаходжання дзяцей-падлеткаў. Ім прапануюцца выступленні рэквіем-тэатра «Украдзенае вайной дзяцінства» паводле кнігі С. Алексіевіч «Апошнія сведкі» і ўспамінаў бярэзінцаў у статусе «дзяцей вайны». Вечарына «Маё ваеннае дзяцінства» збярэ жыхароў Беразіно, чыё дзяцінства апаліла вайна.

**Акцыя «Белы журавель»** стартуе 22 чэрвеня, да дня пачатку Вялікай Айчыннай, у памяць аб земляках, якія загінулі на той страшнай вайне. Тры гады – 1 100 дзён і начэй – вісела над Бярэзінскім краем чорная ноч гітлераўскай акупацыі. Былі павешаныя 372 чалавекі, расстраляныя звыш 3 тысячаў, вывезеныя ў Германію 1 508, спаленыя 30 вёсак, у т.л. разам з жыхарамі – 6, з іх 4 (Войціхава, Тоўсціца, Клешчыцы, Уцешына) не адрадзіліся пасля вайны. **Тыдзень памяці вёсак**, спаленых у гады вайны **«Званы Хатыні на Бярэзіншчыне»** ў канцы чэрвеня прадставіць сучаснікам тэатр-рэквіем «Нас спалілі разам з вёскай» паводле кнігі Янкі Брыля, Алеся Адамовіча, Уладзіміра Калесніка «Я – з вогненнай вёскі» і самавыдавецкага выдання ЦБ «Выпрабаваныя агнём», а таксама гадзіну-рэквіем «Стаіць у полі замест вёскі толькі помнік», прысвечаны вёсцы Уцешына з гаротным лёсам Хатыні.

*Ліпень* – асаблівы месяц года: 3 ліпеня – 70-годдзе вызвалення, 17 ліпеня –90-годдзе раёна. У гонар знамянальных датаў бібліятэкарамі ініцыяванае правядзенне **вулічных святаў-акцыяў «Салют Перамозе, паклон ветэранам»** з выступленнем тэатра аднаго акцёра ЦБ «Салдатам я прайшла па той вайне», імправізаваным паэтычным мікрафонам «Мы чытаем вершы пра вайну». **Акцыя «Вуліцы герояў»** будзе прымеркаваная да ўрачыстага адкрыцця мемарыяльных дошак героям, чые імёны носяць вуліцы Беразіно: Мікалаю Мультану (Герой Савецкага Саюза, удзельнік вызваленчых баёў за горад), Веры Лясных і Марыі Рамановіч (партызанскія сувязныя).

*У жніўні* пройдзе заключны этап **пошукавай акцыі «Георгіеўскія кавалеры нашых вёсак»**, прымеркаванай да 100-годдзя Першай сусветнай вайны. Будуць наладжаныя трыбуны адкрытага пісьма «Пісьмо з далёкай вайны», вахта памяці «Пераклічка стагоддзяў – пераклічка імёнаў».

Да Дня міру і пачатку Другой сусветнай вайны будзе наладжаная **сустрэча трох пакаленняў «Дзве вайны: дыстанцыя ў паўвека»** з удзелам былых воінаў Вялікай Айчыннай вайны, воінаў-інтэрнацыяналістаў афганскай вайны і старшакласнікаў пад дэвізам «У вайны не бывае пераможцаў». Да Дня бібліятэк *15 верасня* будзе прымеркаваная **творчая справаздача бібліятэкараў з прэзентацыяй альбома-эстафеты «Бібліятэчны салют 70-годдзю вызвалення»**.

*Кастрычніцкая* акцыя да Дня пажылых людзей **«Залаты фонд грамадства – ветэраны»** арыентаваная на выхаванне павагі да людзей сталага ўзросту, чые біяграфіі пазначаныя ваеннай трагедыяй (у раёне 44 ветэраны). Да Дня маці ў працоўных калектывах Беразіно, 10-і аграгарадках раёна сумесна з грамадскай арганізацыяй «Беларускі саюз жанчын» маштабна пройдзе акцыя **«Тры пакаленні жанчын супраць вайны»**.

***Набярэцца 70 ці больш бібліятэчных справаў – не прынцыпова. Галоўнае, добрых справаў шмат не бывае. Сёлетні бібліятэчны праект стане пралогам мерапрыемстваў 2015 года, прымеркаваных да 70-годдзя Вялікай Перамогі.***

*Тамара КРУТАЛЕВІЧ,*
*загадчык аддзела маркетынгу Бярэзінскай ЦБ*

Наш каляндар

# Першы беларускі энцыклапедыст

***Аляксандр Карлавіч ЕЛЬСКІ – беларускі гісторык, краязнаўца, этнограф, пісьменнік, перакладчык, публіцыст, адзін з першых гісторыкаў беларускай літаратуры і збіральнікаў беларускіх рукапісаў, сябра Акадэміі ведаў у Кракаве.***

Нарадзіўся 16 чэрвеня 1834 г. у маёнтку Замосце каля в. Дудзічы Ігуменскага павета (цяпер – Пухавіцкі раён). Належаў да каталіцкага роду Ельскіх (гербу «Пелеш»), які адносіўся да сярэднезаможнай шляхты Вялікага Княства Літоўскага. Пачатковую адукацыю атрымаў у гімназіі ў г. Лаздэне (Усходняя Прусія), скончыў Мінскую гімназію (1852). Служыў у расійскім войску

Партрэт А. Ельскага (мастак І. Урублеўскі)

Герб «Пелеш»

карнетам, удзельнічаў у Крымскай вайне 1853 – 1856 гг. У 1855 г. памірае яго бацька – Караль Ельскі, і ўся яго спадчына пераходзіць да Аляксандра і двух яго братоў. Родавы маёнтак Дудзічы дастаецца яго старэйшаму брату – Міхалу, а Аляксандр становіцца ўладальнікам другога маёнтка па суседству – Замосце. Ён адмаўляецца ад вайсковай службы, будуе новы дом, актыўна, са шчырасцю, займаецца гаспадарчымі справамі і добраўпарадкаваннем новага маёнтка. А. Ельскі выводзіць сваю гаспадарку на высокі ўзровень, выпісвае з Еўропы новую тэхніку, змагаецца з п'янствам, у 1864 г. стварае літаратурна-краязнаўчы музей, у якім сабраў каля 10 тысячаў кніг (у тым ліку старадрукі, амаль усе польскія і беларускія хронікі, дыярыушы і інш.), больш за 2 тысячы гравюраў, калекцыі карцінаў, манетаў, археалагічных знаходак, шмат малюнкаў заходнееўрапейскіх і мясцовых мастакоў, асобныя рэчы і лісты Адама Міцкевіча і Тадэвуша Касцюшкі, калекцыі фарфору, шкла, слуцкіх паясоў, каля 20 тысячаў аўтографаў і дакументаў.

У сваім маёнтку Ельскі разводзіў рыбу, займаўся добраўпарадкаваннем парку, дзе заклаў унікальную травяністую паляну.

Пісаць Ельскі пачаў з маладосці, на беларускай, рускай і польскай мовах. Літаратурна-публіцыстычная дзейнасць пачалася з допісаў у газету «Віленскі веснік» прысвечаных пераважна вызваленню сялянаў ад прыгону. Добра ведаў французскую і нямецкую мовы. Публікацыі часта падпісаныя псеўданімамі Бацян з-над Пцічы, Літвін-Грамадзянін, Свядомы. Ельскаму належыць некалькі вершаваных і

Сядзібны дом А. Ельскага ў Замосці

празаічных твораў на беларускай мове – «Сынок» (1895), «Выбіраймася ўпрочкі» (1896), «Слова аб праклятай гарэлцы і аб жыцці і смерці п'яніцы» (1900). Выдаў зборнік «100 прыказак, загадак, прыдумак і гавэндаў для пажытку беларускага (крывіцкага) народа» (Вільня, 1908). У творчай спадчыне Ельскага шмат працаў на польскай і рускай мовах, прысвечаных пераважна мінуламу Беларусі, яе гісторыі, эканоміцы. Сярод найбольш значных – «Заўвагі аб сялянскім пытанні» (1884), «Пра беларускую гаворку» (1885), «Слоўца пра матэрыялы для вывучэння беларускай гаворкі, этнаграфіі і літаратуры»(1886), «Нарыс гісторыі мясцовай гаспадаркі ў супастаўленні з народнымі звычаямі ад першабытных да астатніх часоў» (1893 – 1897), «Гістарычныя звесткі пра Радзівілаўскую ткальню паясоў у Слуцку» (1893), «Гістарычныя звесткі пра фабрыку шкла і аздобных люстэрак ва Урэччы Радзівілаўскім на Літве» (1899) і інш. Напісаў больш за 10 тысячаў гістарычна-краязнаўчых артыкулаў пра Беларусь для «Геаграфічнага слоўніка Каралеўства Польскага і іншых краёў славянскіх» (тт. 1 – 14, 1880 – 1895), «Вялікай універсальнай ілюстраванай энцыклапедыі» (тт. 7 – 8, 1892).

Аляксандр Ельскі пераклаў на беларускую мову першую частку паэмы Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш» (Львоў, 1892). Ельскі – першы біёграф і сябра пісьменніка В. Дуніна-Марцінкевіча. Менавіта ў яго апынуліся рукапісы са славутага куфра, які ў доме Дуніна-Марцінкевіча бачыў пад час навучання Ядвігін Ш. Ён перапісваўся і з Францішкам Багушэвічам і іншымі беларускімі пісьменнікамі.

Памёр Аляксандр Ельскі 10 верасня 1916 г. у маёнтку Замосце і быў пахаваны ў Дудзічах, на ўрочышчы Кобань, што з'яўляецца месцам сямейных пахаванняў Ельскіх.

*Падрыхтаваў*
*Алесь САЧАНКА*

# У кожным сэрцы Быкаў жыве

***Да 90-годдзя з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава і памяці яго сяброў – паэтаў Рыгора Барадуліна і Генадзя Бураўкіна***

**Уздоўж**

**3**. Мужчынскае імя. **6**. «Праклятая ...». Аповесць В. Быкава (1968 г.). **9**. «Да памяці тваёй не прыліпае // Ні павуцінне звад, ні подлы ...». З верша Г. Бураўкіна «Ідзе жыццё», прысвечанага памяці В. Быкава і змешчанага ў апошнім яго паэтычным зборніку «Нагаварыцца з зоркамі». **11**. Званне, якім неаднаразова ўзнагароджваўся В. Быкаў. **12**. Забарона, адмена рашэнняў. **16**. «Калі ... выб'ецца з туману, // Толькі іх і ўспомніць хор народаў, // Воінаў сваіх, святых і раненых, // Рыцараў сумлення і свабоды». З верша У. Караткевіча «Васілю Быкаву». **17**. Узвышаная раўніна. **18**. Вялікі апавядальны твор; да яго адносіцца твор В. Быкава «Кар'ер» (1986 г.). **19**. Горад у Мінскай вобласці. **20**. Тое, што і кінафільм; дакументальнае ... пад назвай «Узыходжанне» пра В. Быкава стварыў кінарэжысёр, народны артыст Беларусі В. Дашук. **21**. Пахкая смала некаторых дрэваў. **25**. «Надрываецца артылерыя, // ... пажарышчаў, стогны раненых». З верша Максіма Танка «Ля тэлевізара». **27**. «Трэцяя ...». Аповесць (1961 г.), па матывах якой быў зняты мастацкі кінафільм. **28**. «Штоночы ўстаюць і ідуць на заданне // Хлопцы-... апошняй вайны». З верша Г. Бураўкіна, прысвечанага В. Быкаву.

**Упоперак**

**1**. «А як Радзіме жыць без Васілька? // Ці будзе каласіцца ў полі ...?». З верша Г. Ліхтаровіча «Памяці Васіля Быкава». **2**. Буйная драпежная жывёліна. **4**. «Ды ён не там, дзе змрок, дзе тлен і тло. // Ён тут, дзе дух жывы, дзе ... і дзе святло». З верша А. Вярцінскага «Ён недзе тут...», прысвечанага памяці В. Быкава. **5**. Дакумент, які маці В. Быкава Ганна Рыгораўна атрымала з воінскай часці аб тым, што яе сын Васіль загінуў на фронце (разм.). **7**. «Воўчая ...». Аповесць пісьменніка (1998 г.) аб жыцці ў чарнобыльскай зоне. **8**. «Ёсць ...! // Беларусь жыве, // Пакуль жыве ў кожным сэрцы Быкаў». З верша Р. Барадуліна «Ратай», прысвечанага памяці пісьменніка. **10**. Узор, жывапіснае графічнае ўпрыгожанне. **13**. Выгнанне. **14**. ... – каму вяроўка, а каму дойная кароўка (прык.). **15**. Прыстасаванне, якое прыводзіць у рух курок пад час стрэлу. **22**. Травяністая расліна з прыемным вострым пахам. **23**. «Партызанскі ...». Шэраг твораў В. Быкава, аб'яднаных тэмай партызанскай барацьбы з ворагам; да іх ліку адносяцца аповесці «Сотнікаў», «Абеліск» ды інш. **24**. Зборнік вершаў Р. Барадуліна, за які паэт у 2006 годзе быў сярод намінантаў на Нобелеўскую прэмію ў галіне літаратуры. **26**. «Новый ...». Усесаюзны часопіс, у якім друкаваліся многія творы В. Быкава.

*Склаў*
*Лявон*
*ЦЕЛЕШ*

# Выявы Міншчыны

З 4 па 15 чэрвеня ў Рэспубліканскай мастацкай галерэі Беларускага саюза мастакоў экспанавалася выстаўка жывапісу Дзмітрыя Сарокі «Краявіды Міншчыны», прымеркаваная да 70-годдзя мастака. У экспазіцыю ўвайшло з сотню твораў. Гэта яго другая персанальная выстаўка, дзе так поўна прадстаўленая рэтраспектыва за сорак гадоў.

На адкрыцці выстаўкі з віншавальнымі словамі выступілі старшыня саюза мастакоў Рыгор Сітніца, яго намеснік па выставачнай дзейнасці Леанід Хобатаў, паплечнік па педагагічнай працы Кім Шастоўскі, а таксама сябар з часоў навучання ў Мінскім мастацкім вучылішчы Сяргей Салохін.

Усе працы напісаныя з натуры, дзе з дакументальнай дакладнасцю зафіксаваныя выявы маляўнічых куточкаў прыроды, большасць з якіх сёння ўжо антрапагенна трансфармаваная. Напрыклад, захаваныя на палотнах выявы берагоў Свіслачы ад Заслаўскага вадасховішча да Камсамольскага возера, дзе цяпер зладжаны каскад вадасховішчаў.

Цыкл працаў, прысвечаных музеям, мемарыяльным мясцінам і замкавым комплексам, выкананыя мастаком на тэрыторыі Музея народнай архітэктуры і побыту, філіялаў літаратурных музеяў Максіма Багдановіча, Якуба Коласа і Янкі Купалы, у Нясвіжы.

Творчая манера Д. Сарокі адметная. Яго стыль можна аднесці да імпрэсіяністцкага напрамку. Тонкая стрыманая каларыстыка жывапісу майстра адлюстроўвае характэрныя рысы станаў беларускай прыроды ў розныя поры года. Жывапісныя краявіды насычаныя паветрам, дыхаюць цішынёю і прасторай, на іх тонка пераданая багатая каляровая гама адценняў асяроддзя. Зацягнутыя блакітнаватай смугой восеньскія пейзажы пакідаюць адчуванні пахаў восеньскай свежасці, апалага лісця, студзёнасці вады.

*Наш кар.*
*Фота Наталі КУПРЭВІЧ*

# «Рэха ДАХу – II»

*Перформанс З. Юркевіча і А. Родзіна*

***Сёлета 30 мая ў музеі-сядзібе «Пружанскі палацык» другі раз адбыўся фестываль эксперыментальнага мастацтва «Рэха ДАХу», прысвечаны славутай асобе беларускай мінуўшчыны Тадэвушу Рэйтану.***

Трэба адзначыць, што гісторыя фестывалю «ДАХ» (DACH) пачынаецца з 2001 г., калі ў берлінскім кунстхаусе «Тахелес» упершыню адбылася выстаўка сучаснага беларускага мастацтва. Праз два гады праект, распачаты некалькімі мастакамі-энтузіястамі, перарос у міжнародны фестываль саверсізму і ігдрасілізму (сучасных мастацкіх накірункаў), у якім прынялі ўдзел больш за 100 музыкаў, мастакоў, літаратараў, фатографаў і іншых творчых людзей з розных краінаў свету. Гэтая складаная для ўспрымання мастацкая тэрміналогія з'явілася ў «дахаўцаў» не як даніна нейкай модзе, а стала вынікам творчых шуканняў, глыбокіх пачуццяў, роздумаў, своеасаблівага звароту ад сучаснасці да мінуўшчыны. Тэрмін саверсізм быў утвораны ад слова, якое ўжывалі ў сваім лексіконе першыя хрысціянскія місіянеры яшчэ ў канцы 1 тыс. н.э., і азначала яно «сеянне разумнага, добрага, вечнага». Слова ігдрасілізм паходзіць ад назвы Ігдрасіль – свяшчэннага дрэва ў старажытнаскандынаўскай міфалогіі, што сімвалізавала яднанне сучаснасці з мінулым. У 2012 г. гэты самабытны фэст-эксперымент рушыў па Беларусі, а яго першы выязны форум адбыўся ў музеі-сядзібе «Пружанскі палацык» пад назвай «Рэха ДАХу».

Сёлета шматгадзінная праграма фестывалю была насычаная самымі разнастайнымі падзеямі і цікавымі сустрэчамі. Яна складалася з некалькіх частак, аб'яднаных агульным сэнсам – сучаснасць і мінулае непадзельныя, а эксперымент – гэта не пустое самавыяўленне, а заклік да роздуму. Агульны тон імпрэзе надаў перформанс Змітра Юркевіча і Алеся Родзіна – куратараў фестывалю, кіраўнікоў мінскай арт-суполкі імя Т. Рэйтана. Вяртанне да каранёў, глыбокае асэнсаванне мінулага, суперажыванне трагізму падзеяў беларускай гісторыі і яе прадстаўніка Т. Рэйтана, адраджэнне праўды – усё гэта знайшло адлюстраванне ў ім. Яны таксама прадставілі на суд гледача сумесны мастацка-гістарычны (больш за 15 графічных працаў) праект «Род Рэйтанаў. Асобы і падзеі» – своеасаблівы даведнік пра славуты беларускі род, чыя сядзіба ў в. Грушаўка (сучасны Ляхавіцкі раён) працягвае ўражваць веліччу і запусценнем.

Своеасаблівай спробай вяртання да мінулага стаў цікавы майстар-клас па старадаўніх беларускіх народных танцах, які імправізацыйна зладзілі харэограф Алена Прохарава з Мінска і музыка Іван Гвоздзік з Пружанаў. Пад час фестывалю пружанцы таксама сталі ўдзельнікамі цікавага нацыянальнага праекта «Мова нанова». Нестандартны занятак па сучаснай беларускай мове правяла Юлія Траццяк з Баранавічаў. Госці таксама былі запрошаныя на кінапаказ, пад час якога былі прадстаўленыя ўрывак з дакументальнай стужкі «Тадэвуш Рэйтан – беларускі Дон Кіхот» (з праекта АНТ «Зваротны адлік») і фільм маладога беларускага рэжысёра Алены Ясінскай «Апошняя з роду Рэйтанаў». Сваімі творчымі пошукамі змаглі падзяліцца музыкі і выканаўцы Дзіма СКУ і Сяржук (Баранавічы), Віктар Сямашка і Раман Яраш (Мінск), Ганна Мязга і Яўген Шаталаў (Пружаны).

У рамках фестывалю адкрыліся некалькі цікавых выставак, дзе прадстаўлена каля 100 арыгінальных працаў сучасных беларускіх мастакоў. Асаблівае месца сярод іх займаюць жывапісныя палотны А. Родзіна, Алены і Пятра Шарыпаў, Змітра Вішнёва, Анатоля Лабкоўскага, Рыгора Данчанкі і інш. Серыі сваіх здымкаў прэзентавалі фотамастакі А. Ясінская, Крысціна Булас, Валянціна Калеснікава, Алеся Філіпава, Каміла Янушкевіч.

Выстаўкі жывапісу, графікі і фота, якія адкрыліся пад час фестывалю «Рэха ДАХу – II», будуць экспанавацца ў музеі-сядзібе «Пружанскі палацык» да канца чэрвеня.

*Наталля ПРАКАПОВІЧ,*
*галоўны захавальнік фондаў*
*музея-сядзібы*
*«Пружанскі палацык»*

# Малая краязнаўчая энцыклапедыя

*(Пачатак у № 1 за 2003 год)*

**НАВУКО́ВА-ПАПУЛЯ́РНАЯ ЛІТАРАТУ́РА** – творы пра з'явы прыроды, аб'екты навакольнага свету, навуковыя праблемы, пра вучоных, грамадскіх і культурных дзеячаў, адрасаваныя шырокім масам. Жанры: публіцыстычны артыкул, праблемны нарыс, дакументальная аповесць, успаміны, біяграфія, апавяданне, падарожны дзённік, навукова-мастацкія творы. Мастацкі вобраз у такой літаратуры мабілізуе чытача на разважанні, робіць адчувальнай прыгажосць навукі. Праблемы навукі, навуковых пошукаў асвятляюцца таксама ў творах навукова-мастацкай літаратуры.

Рысы навукова-асветнага і папулярызатарскага падыходу да важных філасофска-светапоглядных і грамадска-палітычных праблемаў выяўляліся ў прадмовах Ф. Скарыны, «Катэхізісе» (1562) С. Буднага, творах М. Сматрыцкага, у гістарычных храналографах XVII – XVIII стст. У XIX ст. элементы навукова-папулярнай літаратуры мелі працы краязнаўцаў («Вілія і яе берагі» К. Тышкевіча, «Пінск і яго ваколіцы» Ю. Крашэўскага, «Вандроўкі па маіх былых ваколіцах» У. Сыракомлі, «Падарожжа па Палессі і Беларускім краі» П. Шпілеўскага). Развіццё навукова-папулярнай літаратуры на пач. XX ст. звязанае з газетай «Наша Ніва», дзе друкаваліся матэрыялы пра сельскую гаспадарку, родны край, яго гісторыю, славутых дзеячаў. У часопісе «Лучынка» (1914) Цётка змясціла нарысы «Пералётныя птушкі», «Успаміны з паездкі ў Фінляндыю», «З дарогі». М. Багдановіч выдаў (1914 – 1915) шэраг брашур, у якіх паказваў блізкасць славянскіх народаў.

Пазней навукова-папулярная літаратура набыла сапраўды навуковы характар. Ад сярэдзіны XX ст. штогод выходзіць значная колькасць навукова-папулярных працаў на беларускай і рускай мовах па самых разнастайных галінах ведаў. Іх аўтары – вучоныя, дзеячы навукі, тэхнікі, культуры, пісьменнікі, таленавітыя папулярызатары. Сярод найбольш вядомых кніг – аповесць Янкі Маўра «Чалавек ідзе!..» (1926 – 1927), «Зоры – побач» двойчы Героя Савецкага Саюза лётчыка-касманаўта П. Клімука (1977), «Аб чым расказваюць манеты» В. Рабцэвіча (1979), «Афрыканскае падарожжа» (1963) і «Падарожжа па краіне беларусаў» (1968) В. Вольскага і інш.

З навукова-папулярных выданняў апошніх гадоў варта назваць цыкл «7 цудаў Беларусі» (аўтары Уладзімір Ягоўдзік, Анатоль Бутэвіч), серыю кніг пісьменніка, гісторыка Уладзіміра Арлова і мастака Змітра Герасімовіча «Краіна Беларусь», кнігі Алеся Краўцэвіча, Ірыны Масляніцынай і Міколы Багадзяжа, Алеся Марціновіча, Анатоля Клышкі, Вітаўта Чаропкі, Алеся Бадака, Алеся Наварыча ды інш.

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г. Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Анатоль Грыцкевіч, Вітольд Ермалёнак, Алесь Карлюкевіч, Людміла Кірухіна, Адам Мальдзіс, Сяргей Мітраховіч, Вячаслаў Рагойша, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэуш Стружэцкі.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283 28 26, 334 61 62. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 19.06.2014
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14).
Ліцэнзія ЛП № 02330/85 ад 23.01.2014.
Заказ 540.
Тыраж 988 асобнікаў.